

Фрагмент экспазіцыі «Масонская калекцыя са збору В. П. Федаровіча»

# Канцэптуальныя выставачныя праекты Віцебскага абласнога краязнаўчага музея

*Краснова Яўгенія Леанідаўна,*
навуковы супрацоўнік навукова-экспазіцыйнага аддзела Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, магістр культуралогіі

Канцэптуальная пабудова экспазіцыйнай прасторы, выкарыстанне тэхнічных і дызайнерскіх навінак, інтэрактыўных элементаў, тэатралізаваных і гульнёвых распрацовак набываюць усё большую важнасць, вызначаюць характар і кірунак экспазіцыйнай дзейнасці музеяў. Падобныя рашэнні неабходны для таго, каб «голас музея быў пачуты ў насычанай інфармацыйна-забаўляльнай прасторы (…), і быў «здольны скласці канкурэнцыю сучасным медыйным тэхналогіям» (Я. Дранкіна).

Паводле меркаванняў даследчыкаў, «экспазіцыя ўяўляе з сябе спецыфічную навуковую працу і, разам з тым, з'яўляецца своеасаблівым творам мастацтва, спалучаючы ў сабе строгую навуковую дакладнасць і прадметнасць з вобразнасцю і эмацыянальнасцю» (Ю. Пішчулін). Сучасная музейная экспазіцыя павінна не проста адлюстроўваць асобныя гісторыка-культурныя падзеі, але і прадстаўляць па-мастацку арганізаваную прастору. Менавіта экспазіцыя становіцца ключавым момантам усёй музейнай прасторы, здольнай уступаць у дыялог з наведвальнікам, даваць веды і ўзбагачаць уяўленне гледача яркімі і атрактыўнымі вобразамі.

Немалаважнае месца падчас праектавання экспазіцыі належыць навуковай канцэпцыі, змест якой павінен адлюстроўваць усе асноўныя моманты стварэння новай экспазіцыі. Этап праектавання з'яўляецца вызначальным, паколькі менавіта ён прадугледжвае апісанне асноўнай ідэйнай задумы будучай экспазіцыі, абгрунтаванне тэмы, выбар асноўных сродкаў музейнай інтэрпрэтацыі.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей валодае дастатковай экспазіцыйнай прасторай, якая дазваляе размяшчаць стацыянарныя экспазіцыі,



**Віцебскі абласны краязнаўчы музей** заснаваны як Віцебскі губернскі музей 12 лістапада 1918 г. пастановай Віцебскага губернскага аддзела народнай асветы. Адчынены для наведвальнікаў у маі 1919 г. у будынку былой духоўнай семінарыі. 19 лістапада 1924 г. Саўнаркамам БССР была прынята пастанова аб стварэнні Віцебскага аддзялення Беларускага дзяржаўнага музея. Музей размясціўся ў будынку былой гарадской ратушы. Першая экспазіцыя адкрылася 27 красавіка 1925 г. Колькасць прадметаў асноўнага фонду сёння складае больш за 200 тысяч адзінак.

У галоўным будынку Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ратушы) размяшчаюцца асноўная экспазіцыя і доўгатэрміновыя выставы: «Прырода Віцебскага краю», «Старажытны Віцебск IX — XIV стст.», «Абаронцы Айчыны 1941—1945 гг.». Экспазіцыя прыроды лічыцца лепшай экспазіцыяй свайго профілю ў рэспубліцы. За мінулы год праведзена больш за 100 выстаў, у тым ліку 4 па-за межамі музея. Музей актыўна супрацоўнічае з музеямі і культурнымі ўстановамі рэспублікі і замежжа (Латвія, Літва, Расія, Польшча).

што распавядаюць аб гістарычных і культурных падзеях Віцебскага краю.

Несумненную каштоўнасць маюць доўгатэрміновыя выставы, накіраваныя на дэманстрацыю прадметаў з фондавых калекцый музея. Адным з найцікавейшых праектаў 2011 г. стала часовая выстава «Масонская калекцыя са збору В. П. Федаровіча», якая была адзначана дыпломам «Умацаванне прэстыжу музейнай прафесіі» і грашовай прэміяй падчас удзелу ў Міжнародным фестывалі музеяў «Інтэрмузей—2011» у Маскве. Выстава мела на мэце пашырэнне міжмузейных сувязей і магчымасцей музея ў дэманстрацыі найкаштоўнейшых фондавых калекцый.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей валодае значнай калекцыяй, звязанай з гісторыяй масонства. На сённяшні дзень у яго фондах захоўваецца 98 прадметаў, звязаных з гісторыяй еўрапейскага і рускага масонства XIX ст., якія распавядаюць аб рытуалах і сімволіцы братэрства «вольных муляроў». Гэта сапраўдныя рукапісы і дакументы, масонскія знакі адрознення, рытуальныя прадметы (фартухі, кельні, малаткі, стужкі), якія належаць да канца XVIII — першай чвэрці XIX ст.

Выстава ўключае экспанаты з розных калекцый музея: запоны, стужкі, масонскія знакі рускіх і польскіх ложаў, 16 стэндаў, дзе змяшчаюцца дакументальныя і ілюстрацыйныя матэрыялы. Захаванасць некаторых прадметаў не дазваляе экспанаваць іх у арыгінале, таму на выставе выкарыстаны іх фотакопіі. Недахоп выставачнага матэрыялу кампенсуецца ўдалым мастацкім афармленнем выставы, якая мае адзінае каляровае рашэнне, кампазіцыйную будову і выразна арганізаваную структуру, што значна пашырае яе камунікатыўны патэнцыял. Дэманструючы сапраўдныя прадметы, звязаныя з вучэннем і рытуаламі масонаў, выстава ўносіць уклад у асэнсаванне гэтага цікавага і неадназначнага рэлігійна-этычнага вучэння. Экспанаванне дадзенай выставы ў музеях краіны набыло прыкметную папулярнасць і атрымала ўдзячны водгук з боку наведвальнікаў.

Не застаўся ўбаку і масонскі форум, дзе разгарэліся гарачыя дыскусіі адносна выставы і прадстаўленай калекцыі [2]. Згадаем некаторыя выказванні: «В Беларуси богатейшая масонская история, которой республика по праву может гордиться — наряду со многими другими славными и занимательными страницами своего прошлого. То, что такая выставка состоится, — настоящее событие», «Событие, тем не менее, хорошее и если будет интерес у интересующихся, то вдвойне полезное дело».

Хваля звестак і меркаванняў аб выставе прайшла таксама ў сродках масавай інфармацыі: у газетах «Вечерний Гомель», «Беларусь сегодня», тэлерэпартажах Нацыянальнага тэлебачання, на шматлікіх інтэрнэт-сайтах [3; 4; 5; 6; 8; 10; 11]. Такое стаўленне пацвярджае актуальнасць выставы і цікаўнасць наведвальнікаў да старонак гісторыі сваёй краіны.

Разуменне неабходнасці адаптацыі да новых сацыякультурных умоў і пажаданняў сучаснага наведвальніка патрабуе ад музея быць «правадыром беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў шырокі сусветны кантэкст культуры», што няўхільна адбіваецца на яго дзейнасці, і, перш

за ўсё — на экспазіцыйнай практыцы [1]. У гэтай сувязі Віцебскі абласны краязнаўчы музей звярнуўся да распрацоўкі канцэпцыі выставы, якая раскрывае ўнікальнасць нацыянальнай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны і накіравана на папулярызацыю ведаў аб традыцыйнай беларускай культуры. Вынікам стала дэманстрацыя калекцыі ручнікоў на выставе «Беларускі ручнік: з глыбіні стагоддзяў».

У аснове выставы ляжыць калекцыя ручнікоў і посцілак, агульная колькасць якіх складае больш за 180 прадметаў. Дадзеная калекцыя дае магчымасць шырокай інтэрпрэтацыі ролі і месца гэтых помнікаў народнай творчасці ў традыцыйнай бытавой і святочнай культуры беларусаў. Большасць прадстаўленых на экспазіцыі прадметаў датуюцца к. XIX — пач. XX стст. Асаблівае значэнне набывае тэрытарыяльная, функцыянальная і тэхналагічная дыферэнцыяцыя прадметаў.

Выстава структурна падзелена на тры тэматычныя блокі, што дазваляе лагічна і паслядоўна экспанаваць дэманстрацыйны матэрыял, ствараючы адзіны сюжэтны вобраз, які раскрываецца пры дапамозе сінтэзу экспанатуры і мастацкага афармлення залаў. Цікавасць выклікае і інтэрактыўная частка выставы, прадстаўленая ў выглядзе ўключэння ў экскурсію элементаў наказу працэсу ткацтва. Экскурсія, на якой паслядоўна раскрываюцца ўсе тэматычныя падзелы, спрыяе з'яўленню цікавасці наведвальнікаў, узнікненню ў іх матывацыі да непасрэднага ўдзелу ў творчым працэсе стварэння саматканага палатна. Атрымаўшы вычарпальную інфармацыю аб вырабе і выкарыстанні ручнікоў, наведвальнік можа паспрабаваць саткаць частку палатна або проста паглядзець працу сучасных майстрыц, якія праводзяць на выставе майстар-класы.

Яркім прыкладам інтэрактыўнасці стала мерапрыемства падчас афіцыйнага адкрыцця выставы. Майстрыца Сафія Савельеўна Глот распавяла аб адраджэнні традыцый ткацтва, далучэнні дзяцей да гэтага старажытнага рамяства, прадэманстравала свае майстэрства на ткацкім станку. Успрыманне выставы дапаўнялася музычным суправаджэннем і каментарыямі.



Фрагмент экспазіцыі «Масонская калекцыя са збору В. П. Федаровіча»

Напаўненне экспазіцыйнай прасторы інтэрактыўнымі элементамі пакінула прыемнае ўражанне аб выставе. Наведвальнікі адзначалі: «Замечательная экспозиция, навевает воспоминания прошлого о своих бабушках, дедушках, о своих корнях. Спасибо, что помогли окунуться в былое и такое редкое», «Говорят, без прошлого нет настоящего и будущего… Очень интересно окунуться во времена наших дедов и прадедов, чем жили, тем более в наш век технического прогресса. Спасибо за замечательную выставку», «Приехав из Минска и попав на экспозицию белорусских ручников, окунулась в мир спокойствия и домашнего уюта, исходящего из периода XIX века, со всеми постилками, ручниками и со всем, что связано с бытом наших предков. Спасибо за это сохранённое тепло и с душой оформленную выставку». Такія выказванні пацвярджаюць факт неабходнасці ўкаранення ў экспазіцыйную прастору музея сучасных форм актывізацыі наведвальнікаў, якія могуць атрымаць не толькі цікавую інфармацыю, але і багаты пачуццёва-эмацыйны вопыт.

Выстава з'яўляецца адметным дэманстрацыйным дапаможнікам для атрымання неацэннай інфармацыі аб тэхналогіі вырабу і выкарыстанні ручніка ў бытавой і святочнай культуры беларусаў, а таксама знаёміць з духоўным светам і багатымі традыцыямі нашых продкаў.

Пры стварэнні паўнавартаснай экспазіцыі велізарнае значэнне набываюць не толькі экспанаты, але і дэкаратыўныя элементы, якія напаўняюць залы падзейнай атмасферай, ствараюць дадатковы сэнсавы кантэкст. Кожны прадмет, мастацкі комплекс, уключаны ў адзіны камунікатыўны працэс, здольны ператварыць наведванне музея ў запамінальную падзею. Выкарыстанне разнастайных матэрыялаў, увядзенне ў экспазіцыйнае асяроддзе вобразна-пластычных элементаў дазваляе ўдала вырашаць пытанні мастацкага афармлення экспазіцыйных залаў.

Сучасная навукова-экспазіцыйная практыка Віцебскага абласнога краязнаўчага музея адкрывае шырокія магчымасці для раскрыцця нашага гістарычнага мінулага і прэзентацыі культурных каштоўнасцей шляхам стварэння інтэрактыўных выстаў, якія садзейнічаюць больш шырокаму далучэнню маладога пакалення да неабходнасці захавання нацыянальнай спадчыны і да музейнай культуры.

*Літаратура*


1. Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2005 / уклад. і навук. рэд. І. Б. Балагова. — Мінск, 2005.
2. Выставка Масонская коллекция Электронный ресурс Масонский форум. — Режим доступа: http://mason.ru/newforum. — Дата доступа: 28.05.2011.
3. В Гомеле впервые представили раритетную коллекцию масонских знаков Электронный ресурс Моя реклама. — Режим доступа: http://www.moyareklama.by/Гомель/новости/120347/start=5. — Дата доступа: 04.03.2011.
4. В Гомеле открылась выставка масонских знаков и символов Электронный ресурс Информационный портал. — Режим доступа: http://www.naviny.by. — Дата доступа: 11.03.2011.
5. Выставка Масонская коллекция Электронный ресурс Официальный сайт Гомельского дворцово-паркового ансамбля. — Режим доступа: http://www.palacegomel.by/index.php?newsid=611. — Дата доступа: 06.04.2011.
6. Добронравов, Г. Масоны в Гомеле / Г. Добронравов // Вечерний Гомель. — 17 марта 2011. — № 11 (1210).
7. Дранкина, Е. Смена экспозиции / Е. Дранкина // Музей. Научно-практический журнал. — 2006. — № 5.
8. Коллекцию масонских знаков и символов XVIII-XIX веков можно будет увидеть на выставке в Гомеле Электронный ресурс Белорусское телеграфное агентство. — Режим доступа: http://www.belta.by/ru/all_news/culture?id=544616. — Дата доступа: 04.03.2011.
9. Пищулин, Ю. П. Экспозиция как важнейшее направление работы музея / Ю. П. Пищулин, А. С. Соустин // Музейное дело в СССР. Совершенствование музейного дела как важнейший фактор повышения его эффективности: сб. науч. тр. — М., 1987. — Вып. 17.
10. Раритетная коллекция масонских символов XVIII — XIX столетия выставлена в Гомеле Электронный ресурс Общенациональное телевидение. — Режим доступа: http://ont.by/dev/widgets/tagcloud/tagcloud.swf. — Дата доступа: 08.03.2011.
11. Раритетная коллекция масонских символов XVIII — XIX столетия выставлена в Гомеле Электронный ресурс Беларусь сегодня. — Режим доступа: http://sb.by/_res/print.css. — Дата доступа: 08.03.2011.